Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЛЮТАГА 2020 г. СУБОТА № 36 (29150)

## Моц і сіла дзяржавы!

Таварышы салдаты, сяржанты, прапаршчыкі і афіцэры!
Паважаныя ветэраны!
Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Прытрымліваючыся прынцыпаў адданасці Радзіме, вернасці прысязе і гатоўнасці абараняць інтарэсы краіны і народа, вы ўвасабляеце моц і сілу нашай суверэннай дзяржавы.

У год 75-годдзя Вялікай Перамогі мы шануем памяць афіцэраў і салдат, якія аддалі жыццё ў імя будучыні свайго народа. Схіляем галаву перад тымі, хто загінуў у баі, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак. Захапляемся доблесцю і адвагай усіх, хто ўставаў на абарону міру са зброяй у руках і хто сёння ва ўмовах новых глабальных пагроз бярэ на сябе адказнасць за спакой і парадак на роднай зямлі.

Перакананы, што подзвіг ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, мужнасць і гераізм воінаў-інтэрнацыяналістаў, імкненне ваеннаслужачых дзеючай арміі працягнуць слаўныя традыцыі старэйшых пакаленняў з'яўляюцца годным арыенцірам і прыкладам сапраўднага патрыятызму для беларускай моладзі.

Жадаю моцнага здароўя, прафесійных поспехаў і мірнай службы.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.**

## ЛІЧБА ДНЯ

**86 %**

*беларускіх мужчын ва ўзросце 15—49 гадоў адчуваюць сябе шчаслівымі і ацэньваюць сваю задаволенасць жыццём у сярэднім на 7 балаў па 10-бальнай шкале. Такую інфармацыю прыводзіць Белстат. Узровень занятасці мужчын у працаздольным узросце склаў 82,1 %. Сярэдні ўзрост занятых мужчын — 41 год. Кожны чацвёрты мужчына, заняты ў эканоміцы краіны, — ва ўзросце 16—30 гадоў. Па выніках перапісу насельніцтва 2019 года, мужчын у Беларусі больш за 4,3 млн чалавек, або 46,2 % ад агульнай колькасці насельніцтва краіны.*

## КОРАТКА

- **Беларускія вучоныя стварылі базу даных «ДНК-знешнасць-Бел».**
- МЗС лічыць магчымым уступленне Беларусі ў СГА ў канцы 2020 — пачатку 2021 года.
- **Мінэканомікі правосдзіць прававы маніторынг умоў для рамеснікаў.**
- «Беларусь 5» пакажа ЧЕ па біятлоне ў «Раўбічах» у прамым эфіры.
- **Кітай зможа пачаць клінічныя выпрабаванні вакцыны ад каранавіруса не раней за красавік.**
- У Брэсцкай вобласці будуць саджаць больш змешаных лясоў.
- **Мадэльную дзейнасць дадалі ў пералік дазволеных работ для падлеткаў.**
- У Гомельскай вобласці кожны другі прададзены з аўкцыёну аб'ект, які не выкарыстоўваўся, набылі бізнесмены.

ISSN 1990 - 763X

# ФОРМА ІМ ПАСУЕ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Абаронца, ваеннаслужачы — словы мужчынскага роду. Але ў нашай арміі заўсёды былі і дзяўчаты — яе сапраўднае ўпрыгажэнне. З выгляду далікатныя і жаноцкія, яны гатовы выканаць свой вайсковы абавязак нароўні з мужчынамі.**

**На гэтым фота — курсанткі першага курса факультэта сувязі і АСУ Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, аднагрупніцы *(злева направа)* Вераніка БАТУРА, Настасся НЕНАРТОВІЧ, Настасся СТАРАСЦЕНКАВА і Аляксандра ГАРДЗЕЕВА — будучыя сувязісткі айчыннай арміі.**

Максім НЯГОДА:

## «ПАСЛЯ КОЖНАГА МЕДАЛЯ ТРЭБА ПАЧЫНАЦЬ З НУЛЯ»

### Як барысаўчанін са шматдзетнай сям'і стаў чэмпіёнам кантынента

**На чэмпіянаце Еўропы па барацьбе ў Рыме беларуская зборная заваявала восем узнагарод, тры з іх залатыя. Старшыня федэрацыі гэтага віду спорту Камандар Маджыдаў адзначыў, што спартсмены паказалі вельмі яркую барацьбу, заваявалі нават больш узнагарод, чым было запланавана, а значыць, уся каманда працуе ў правільным кірунку. Такія вынікі асабліва цешаць напярэдадні летніх Алімпійскіх гульняў.**

Адну з залатых узнагарод выйграў прадстаўнік грэка-рымскай барацьбы Максім Нягода. Ураджэнец Барысава палепшыў свае вынікі на юніёрскіх і маладзёжных чэмпіянатах і нечакана для канкурэнтаў стаў першым сярод дарослых. Пакуль Максім выступае ў катэгорыі 63 кг, але гэтая вага не алімпійская, таму, магчыма, хутка мы ўбачым маладога беларуса ў больш цяжкай катэгорыі. Пра тое, што самае складанае ў барацьбе, і чаму ўсе браты Нягоды займаюцца гэтым відам спорту, Максім расказаў у сваім інтэрв'ю.



СТАР. 12

На скрыжаванні думак

## Беларуская, руская, сусветная...

### Чаму школьная праграма патрабуе пераасэнсавання, і якім творам там месца

**Ці можна захапіць чытаннем школьнікаў? Для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры гэта пытанне стаіць асабліва востра, бо дамінаванне рускай мовы і не вельмі ўдала складзеная школьная праграма шматразова ўскладняюць іх задачу. «Руская і беларуская літаратуры ў школе і жыцці» — менавіта так сфармулявалі тэму круглага стала, які прайшоў у рамках XXVII Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, яго арганізатары — аўтары шматлікіх кніг для дзяцей і падлеткаў Андрэй ЖВАЛЕЎСКІ і Яўгенія ПАСТЭРНАК.**

СТАР. 7



З першых вуснаў

# «МЫ ЗАХОЎВАЕМ ВЯЛІКІ ІНТАРЭС ДА ПРАМЫХ КАНТАКТАЎ З РАСІЙСКІМІ РЭГІЁНАМІ»

## Прэзідэнт правёў сустрэчу з губернатарам Архангельскай вобласці

**Кіраўнікі Беларусі і Архангельскай вобласці пазнаёміліся пяць гадоў таму ў Мінску. А на гэтым тыдні Ігар Арлоў на ўласныя вочы ўпэўніўся, як за гэты час узрос эканамічны, вытворчы і навуковы патэнцыял нашай краіны. Пакуль праходзіў афіцыйны візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Егіпет, архангельскі губернатар паспеў падрабязна пазнаёміцца з нашымі дасягненнямі. І не толькі ён — у дэлегацыі больш за 50 чалавек, у тым ліку прадстаўнікі прадпрымальніцкай суполкі.**

«Мы захоўваем вялікі інтарэс да прамых кантактаў з расійскімі рэгіёнамі. А вы для нас — увогуле родны чалавек. У нас шмат агульных задач, якія мы мусім вырашаць. У нас дастаткова прамысловых тавараў і тавараў народнага спажывання для гандлю з вашым рэгіёнам. Але вы павінны ведаць, што мы сёе-тое умеем рабіць», — звярнуўся да губернатара Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівa гэта датычыцца будаўнічай сферы. У Прэзідэнта ёсць інфармацыя, што ў Архангельскай вобласці рэалізуецца праграма па перасяленні грамадзян з аварыйнага жылога фонду.

«Можам паказаць нашы магчымасці. Калі спадабаецца — будзеце нас прыцягваць. Мы можам цалкам абсталяваць вашы дамы. Я не думаю, што вы там ужо надта высокі будуеце (мы любой павярхаваці пабудуем), але нават у Беларусі я не арыентуюся на высотку. Людзям трэба камфортнае жыллё», — заўважыў Прэзідэнт, прапанаваўшы пастаўкі і беларускае ліфтавае абсталяванне.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў таксама пра наш вялікі вопыт у машынабудаванні — ад транспарціроўкі грузаў да лесанарыхтоўкі.

«Мы знаходзімся з вамі ў зоне рызыкоўнага земляробства, Архангельская вобласць — у зоне крытычнага земляробства. Мы можам вам дапамагчы і ў племянной справе, і ў вырошчванні агародніннх культур, абсталяванні малочнатаварных фермаў, асабліва цяплічнай гаспадаркі», — выказаў гатоўнасць беларускі лідар.

«Мы гандлюем не толькі ў Расіі, мы гандлюем вельмі шмат ужо ў Еўрасаюзе, але яшчэ больш — з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Адзін з нашых бізнесменаў ужо папрасіў дазволу пастаўляць мясныя прадукты ў Кітай. Вельмі, кажа, выгадна», — падзяліўся інфармацыяй Прэзідэнт.

Згадаў Аляксандр Лукашэнка і пра буйныя тарфяныя радовішчы, якія мае Архангельск. А ў Беларусі ўмеюць працаваць з торфам. І, калі трэба, гатовы нават ствараць сумесныя прадпрыемствы з навучаннем спецыялістаў.

«З Расіяй мы мусім карыстацца паслугамі адно аднаго, аказваць дапамогу і падтрымку. Таму ўсё, пра што вы дамовіліся ў Мінску ў гэты візіт, я гарантую, мы рэалізуем. Мы вельмі абавязковыя людзі ў гэтым плане. З гэтага жыве ўся Беларусь, таму работа з вамі — гэта не дабрачыннасць», — абазначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Па выніках гэтага візіту я чарговы раз упэўніўся, што ўсе нашы ўзаемадзеянні асуджаны на поспех на ўсіх узроўнях. Для Архангельскай вобласці Беларусь, безумоўна, вельмі цікавы і вельмі перспектыўны партнёр», — у сваю чаргу запэўніў Ігар Арлоў.

Ён паведаміў журналістам, што Архангельская вобласць вельмі зацікаўлена ў дапамозе Беларусі ў рэалізацыі буйных нацыянальных праектаў.

«Мы вельмі б хацелі, каб «беларускі квартал» з'явіўся ў цэлым шэрагу нашых гарадоў, дзе мы вядзём маштабныя будоўлі. Канешне, гэта і пасажырскія перавозкі. МАЗы — гэта ўжо атрыбут Архангельска, хацелася б, каб іх з'явілася больш. Немагчыма ўжо ўявіць ні сельскую гаспадарку, ні лясную галіну, ні перавозкі без вашай тэхнікі. Мы буйныя пакупнікі БелАЗаў — больш за 50 аўтамабіляў працуе на алмазных радовішчах», — абмаляваў Ігар Арлоў кірунку супрацоўніцтва. Сярод іншага ён падкрэсліў пажаданасць узаемадзеяння ў развіцці арктычнай зоны Расіі і культурных абменаў. Асабліва моцныя ўражанні ў губернатара выклікала наведванне мемарыяльнага комплексу «Хатынь», і ён упэўнены, што маладое пакаленне мусіць бываць у такіх месцах.

«Дыета — гэта шкодна», — заявіў губернатар журналістам пад уражаннем ад дэгустацыі прадукцыі цяпліц агракамбіната «Ждановічы». А відэавіншаванне жанчынам Архангельскай вобласці ён запісаў на фоне мільёна беларускіх пунсовых руж.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПА ТЭЛЕФОНЕ АБМЕРКАВАЎ АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ З УЛАДЗІМІРАМ ПУЦІНЫМ

**Расія гатова захаваць для Беларусі фінансавы ўзровень па нафце мінулага года.**

«Вы ведаеце, што ў нас часам узнікаюць спрэчкі па асобных пытаннях, і вось ён унёс прапанову, каб мы над ёй падумалі, у тым ліку па пастаўках нафты ў Беларусь. Гэта нечаканая была прапанова, мы, канешне, спрабуем прапліčыць гэту прапанову, але гэта, мабыць, не мае значэння — бо тавар расійскі. Расія можа прадаваць яго па справядлівых цэнах, не па справядлівых, таму што манапаліст — мы ні ад кога больш нафту не атрымліваем. Не атрымлівалі. Тое самае і па газе», — растлумачыў Аляксандр Лукашэнка невялікую затрымку сустрэчы з губернатарам Архангельскай вобласці Ігарам Арловым, якая была запланавана на той жа час.

Па словах Прэзідэнта, Уладзімір Пуцін прапанаваў формулу для разліку, колькі Беларусь сёлета патраціць ад змяншэння мытнай пошліны.

«Калі мы летась ад пошліны атрымлівалі мільярд долараў (дапусцім), а сёлета за кошт зніжэння атрымаем, дапусцім, семсот мільёнаў долараў, — ён сказаў: «Мы трыста мільёнаў долараў кампенсуем у тым ліку за кошт прэмій кампаніям». Такая прапанова... Ну гэта хоць які шлях да развязкі тых спрэчак. Па нафце пытанне стаіць так, што Расія гатова нам захаваць фінансавы ўзровень мінулага года. Ну хоць які рух наперад», — сказаў Прэзідэнт.

«Мы прасілі, каб мы куплялі па сусветнай цане нафту, але кампаніі на гэта не згаджаліся. Да сусветнай цаны яны яшчэ прасілі дадаць дванаццаць долараў прэміі, таму што ў нас, ці бачыце, маржынальныя рынкі Еўропы, Украіны, Беларусі і гэтак далей», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. Але, маркуе ён, гэта і ёсць перавага Беларусі, у той час як перавага Расіі — наяўнасць нафты.

Прэзідэнт даручыў прэм'ер-міністру Сяргею Румасу разлічыць прапанову, каб нарэшце прыйсці да нейкага пагаднення.

***

Падчас тэлефоннай размовы прэзідэнты шмат гаварылі і пра Егіпет, адкуль пасля афіцыйнага візіту напярэдадні вярнуўся беларускі лідар.

«Расія, відаць, чатыры блокі атамнай электрастанцыі будзе будаваць у Егіпце. На радасць ці на жаль, у Расіі высакакласных будаўнікоў ужо не засталося. «Расатам» вельмі задаволены нашымі будаўнікамі. І мы абмяркоўвалі пытанне сумеснага будаўніцтва — гэта было, дарэчы, да будаўніцтва беларускай станцыі, каб мы атрымалі досвед будаўніцтва і разам з расіянамі па ўсім свеце будавалі атамныя станцыі. Таму мы абмеркавалі з ім падрабязна гэту сумесную праграму», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Закрануўшы тэму Беларускай атамнай станцыі, прэзідэнты падчас размовы прыйшлі да высновы, што гэта будзе найлепшая станцыя.

«Найлепшая, якую мы з расіянамі пабудуем. І па такім тыпе расіяне будуць будаваць па ўсім свеце, і мы будзем падстаўляць плячо, дзе трэба», — канстатаваў беларускі Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін таксама абмеркавалі пытанне крэдытных пагадненняў і абавязацельстваў, працэнтных ставак.

«Я ўдзячны Прэзідэнту Пуціну, што ён пазваніў і хоць якія прапановы ўнёс для таго, каб мы маглі спакойна працаваць і не кідаліся ў розныя бакі», — падвёў вынік Аляксандр Лукашэнка.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# БУДЗЕМ ПРАЦАВАЦЬ

## Прэзідэнт ацаніў страты Беларусі ў 2020 годзе ад змяншэння ў Расіі экспартнай пошліны на нафту ў памеры 420—430 мільёнаў долараў

**Пра гэта кіраўнік дзяржавы заявіў на сустрэчы з паслом Беларусі ў Расіі Уладзімірам Сямашкам.**

«Пасля перагавораў з Пуціным і яго прапановы мы палічым цяпер. Гэта ж просты падлік — нашы страты ад змяншэння мытнай пошліны па нафце. І да ўзроўню бягучага года, пры 24 мільёнах тон, гэта прыблізна 420—430 мільёнаў долараў. Вось ад гэтай лічбы мы і будзем ісці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Пуцін прапанаваў, што гэтыя грошы яны Беларусі кампенсуюць. Ён прызнаў, што гэта справядліва», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым ён спаслаўся на заяву расійскага Прэзідэнта, што кампенсацыя будзе праведзена за кошт расійскіх кампаній. «За кошт расійскіх кампаній дык за кошт расійскіх. Але гэта ўжо нейкі рух наперад. І ў гэтым кірунку будзем працаваць», — дадаў беларускі лідар.

Таксама падчас сустрэчы з паслом Прэзідэнт заявіў, што пры цяперашніх умовах на сусветным рынку энерганосьбітаў расійскі газ для Беларусі павінен каштаваць каля 90 долараў за тысячу кубаметраў.

«Што да прыроднага газу, сёння ў Еўропе (і гэта мне сказаў не наш міністр, а буйны расійскі прадпрымальнік — з Сечыным (кіраўнік «Раснафты» Ігар Сечын. — «**БелТА**») мы гаварылі, ён жа таксама газам займаецца) газ таннейшы за 110 долараў. Гэта там — у Еўропе, — на біржах. Значыць, у нас — у раёне 90 долараў. Калі браць сусветную цану», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

«Так, там ёсць працяглыя, яшчэ нейкія кантракты. Але ж доўгатэрміновыя кантракты па газе заўсёды прывязваюцца да цаны на нафту. І калі адбылося падзенне цаны на нафту, значыць, адбылося падзенне цаны на прыродны газ. Таму 127 долараў — сёння ўжо ў свеце такой цаны няма», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

«Таму наша пазіцыя па нафце і па пастаўках прыроднага газу з Расіі па цэнах абсалютна праяснілася. І ў гэтым кірунку мы павінны працаваць», — рэзюмаваў беларускі лідар.

**Паводле БелТА.**

Блізкая ўлада

# Вас пачуюць

**На наступным тыдні можна будзе звярнуцца з праблемамі, якія не ўдаецца вырашыць з дапамогай мясцовых улад, да кіраўніцтва і службовых асоб Адміністрацыі Прэзідэнта:**

**у Полацку** — у аўторак, **25 лютага,** гатовы будзе выслухаць памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці **Анатоль ЛІНЕВІЧ;**

**у Лельчыцах** — у той жа дзень грамадзян прыме памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці **Юрый ШУЛЕЙКА;**

**у Ветцы** — таксама ў аўторак можна будзе звярнуцца да начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення **Вольгі ШПІЛЕЎСКАЙ;**

**у Круглым** — у сераду, **26 лютага,** ёсць магчымасць трапіць на прыём да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта **Ігара СЕРГЕЕНКІ;**

**у адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы** — у сераду людзей з іх скаргамі і прапановамі будзе чакаць памочнік Прэзідэнта — інспектар па горадзе Мінску **Віталь ПРЫМА;**

**у Лунінцы** — у чацвер, **27 лютага,** прыём правядзе першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта **Максім РЫЖАНКОЎ;**

**ва Уздзе** — у той жа дзень можна будзе звярнуцца да начальніка галоўнага ўпраўлення па ўзаемаадносінах з органамі заканадаўчай і судовай улады, пытаннях грамадзянства і памілавання **Жанны ЦІШЧАНКА;**

**у Рэчыцы** — у апошні дзень рабочага тыдня, **28 лютага,** выслухае людзей з іх праблемамі першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі — начальнік упраўлення кіраўнічых кадраў і дзяржаўных узнагарод **Генадзь РАШЭЦЬКА.**

Наша пазіцыя

# Супраць маршу памяці «праклятых салдат»

**З 2011 года 1 сакавіка ў Польшчы адзначаецца дзень памяці так званых «праклятых салдат», якія, адпаведна з афіцыйнай трактоўкай, пасля заканчэння Другой сусветнай вайны працягвалі барацьбу за незалежнасць Польшчы. Але ад гэтых узброеных атрадаў, што вялі антыкамуністычную барацьбу, моцна цярпела мірнае насельніцтва. У прыватнасці, атрад капітана Рамуальда Райса (па мянушцы Буры) у пасляваенныя гады здзейсніў шматлікія забойствы, крадзяжы і здзекі з праваслаўнага насельніцтва — у большасці — этнічных беларусаў, якія жылі на тэрыторыі Польшчы. Так, у 1946 годзе падчас рэйду ў Падляшшы гэтым узброеным фарміраваннем было спалена пяць вёсак, забіта 79 мірных жыхароў.**

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Алег Гайдукевіч заўважыў, што беларускія дэпутаты не могуць пакінуць без увагі тое, што ў польскай Гайнаўцы збіраюцца правесці пяты марш памяці «праклятых салдат» і пры гэтым будуць згадваць у тым ліку і бандытаў, якія здзяйснялі забойствы этнічных беларусаў: «Дазвол такіх маршаў непрымальны ні для якой цывілізаванай краіны, асабліва для тых, якія самі вельмі моцна пацярпелі ад фашызму, нацызму. Мы не можам маўчаць, тым больш таму, што ў апошнія гады асабліва ўмацавалі нашы ўзаемаадносіны з польскімі калегамі, у тым ліку з польскім сеймам, па розных пытаннях: эканамічных, палітычных. Нашы краіны звязвае агульная гісторыя, і мы павінны пра гэта памятаць. Беларусь — краіна, якая будзе заўжды шанаваць памяць пра Вялікую Айчынную вайну і заўсёды называць рэчы сваімі імёнамі. Ніколі калабаранты, нацысты не будуць для нас героямі. Мы ніколі не перапісвалі сваю гісторыю і рабіць гэтага не будзем». Трэба сказаць, што беларускі бок ужо не аднойчы заяўляў пра сваё абурэнне і нязгоду наконт правядзення падобных мерапрыемстваў у суседняй краіне. У той жа час Алег Гайдукевіч выказаў падзяку польскім палітыкам і грамадскім дзеячам, якія таксама выступілі супраць Гайнаўскага маршу, і звярнуліся са сваёй заявай у пракуратуру Польшчы.

Міністэрства замежных спраў Беларусі выказала, у сваю чаргу, шкадаванне, што такое магчыма там, дзе людзі ў поўнай меры перажылі наступствы фашызму.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю намесніка старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Аляксандра Сяргеевіча МІКШЫ і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»!**
**26 марта 2020 года в 11.00 СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ЗАВОДСКОЙ РАЙПИЩЕТОРГ»**

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Варвашени, 50

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2020 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2019 году. Оценка деятельности директора Общества наблюдательным советом. Отзыв наблюдательного совета о годовом балансе Общества.
3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2019 год.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2019 год.
5. О распределении чистой прибыли за 2019 год. О выплате дивидендов за 2019 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли в 2020 году и I квартале 2021 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2020 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
9. Об утверждении корпоративного кодекса и локальных нормативных актов ОАО «Заводской райпищеторг».

Регистрация участников собрания с 9.30 до 10.45 26 марта 2020 года по месту проведения собрания акционеров. Для регистрации при себе иметь документ, удостоверяющий личность (представитель акционера – и доверенность).

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания и иной информацией: в рабочие дни – с 8.45 до 17.00 по месту нахождения Общества, начиная с 6 по 25 марта 2020 года, а 26 марта 2020 года с 8.45 до 11.00. Справки по тел. 8017-375-32-16.

НАБЛЮДАТЕЛЬНЫЙ СОВЕТ.

**Информация о формировании реестра акционеров ОАО «Заводской райпищеторг»**

| | |
|---|---|
| **Полное наименование и место нахождение акционерного общества** | Открытое акционерное общество «Заводской райпищеторг», 220137, г. Минск, ул. Варвашени, 50 |
| **Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров** | Наблюдательный совет Открытого акционерного общества «Заводской райпищеторг», 21.02.2020 года |
| **Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров** | 16.03.2020 года |

УНП 100103703

**«Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» сообщает о проведении очередного общего собрания акционеров**

**Собрание состоится 25 марта 2020 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 02.03.2020.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. О рассмотрении отчета генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2019 году и основных направлениях деятельности Общества в 2020 году.
2. О рассмотрении отчета о работе наблюдательного совета Общества за 2019 год.
3. О рассмотрении отчета о работе ревизионной комиссии Общества за 2019 год.
4. Об утверждении годового отчета, годовой (бухгалтерской) финансовой отчетности Общества и распределение прибыли и убытков Общества за 2019 год с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
5. Об утверждении дивидендов за 2019 год.
6. Об утверждении направления распределения и использования чистой прибыли Общества на 2020 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета.
8. Об избрании членов ревизионной комиссии.
9. Об определении размера вознаграждений и компенсации расходов членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
10. О внесении изменений в устав Общества.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 25 марта 2020 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с документами к собранию начиная с 5 марта 2020 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 28-40-20, 23-64-24 – ОЭАиП.

Наблюдательный совет.

УНП 700049607

| | |
|---|---|
| **Полное наименование и местонахождение акционерного общества** | **ОАО «Элегант»,** Минская область, г. Жодино, пр. Ленина, 22 |
| **Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров** | Наблюдательный совет, ОАО «Элегант». Протокол заседания № 26 от 19.02.2020 года |
| **Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров** | **1 марта 2020 года** |

УНП 600039318

**Считать недействительным** утерянный ЗАО «СК «Белросстрах» бланк страхового полиса «Добровольное страхование грузов» формы 2РП серии ГР № 004282.

УНП 100782388

**Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости»** сообщает о снятии с аукционных торгов **10 марта 2020 года** имущества ОАО «Гродненская обувная фабрика «Неман» лота № 1 (капитальное строение с инвентарным номером 400/С-142786 (контрольно-пропускной пункт)) по заявлению собственника.

УНП 590727594

Важны дзень

# РОДНАЯ АБО ЛІНГВА ФРАНКА?

## У Міністэрства замежных спраў з'явіліся свае стыкеры ў «Вайберы» на беларускай мове

**Гэты праект прэзентавалі на ўрачыстым мерапрыемстве да Міжнароднага дня роднай мовы, якое для МЗС стала традыцыйным і прайшло ўчора ў Нацыянальнай бібліятэцы.**

Урыўкі з твораў аб сваёй айчыне на родных мовах прачыталі больш за 30 дыпламатаў. Усяго запрашэнне на свята прынялі каля 40 кіраўнікоў дыпламатычных місій, акрэдытаваных у нашай краіне. Сярод гасцей і прадстаўнікі міжнародных арганізацый, сябры Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, дзеячы культуры, навукі і адукацыі.

«Я хачу сказаць, наколькі мы ўсе ў Міністэрстве замежных спраў, былі крануты водгукам, які ўбачылі на наша запрашэнне, колькасцю сяброў, што прысутнічаюць сёння ў зале — паслоў, дыпламатаў, гасцей нашых беларусаў. Для нас гэта вельмі дарагі, каштоўны знак вашай увагі», — адзначыў **намеснік міністра замежных спраў Беларусі Андрэй ДАПКЮНАС.**

Ён звярнуўся да гасцей мерапрыемства з пытаннем: наколькі патрэбна для дыпламатыі (прафесіі, якая карыстаецца некалькімі лінгва франка) родная мова? Моц на пабудову мірных зносін і навядзенне мастоў, на яго думку, дае менавіта матчына мова. «Я думаю, што людзі, якія навучыліся ў сваім жыцці шанаваць, любіць, абараняць сваю мову, свой народ, сваю зямлю, — яны маюць сілу, неабходную для таго, каб будаваць масты ўзаемаразумення», — падкрэсліў Андрэй Дапкюнас і пасля прачытаў верш Пімена Панчанкі «Родная мова».

**Марыя ДАДАЛКА.**

Арт-аб'ект

# «МОВА» беларускіх гарадоў

## Вясной у Мінску і абласных цэнтрах узнікне серыя арт-інсталяцый

**Вясной гэтага года ў Мінску, а таксама Брэсце, Віцебску, Гродне, Гомелі і Магілёве з'явяцца незвычайныя мастацкія інсталяцыі. Гэта будуць наборы інтэрактыўных скульптур, якія разам утвараюць слова «МОВА». У Міжнародны дзень роднай мовы, 21 лютага, адзін з мабільных аператараў прадставіў новы праект у межах ініцыятывы «Веліч роднай мовы».**

Манументальныя тэкставыя інсталяцыі станучь месцамі камфортнага адпачынку, бо фактычна ўяўляюць сабой вулічную мэблю, выраблёную з дрэва і металу. Аўтар арт-аб'ектаў — вядомы беларускі скульптар Павел Вайніцкі. Па яго задуме, «МОВА» служыць месцам камунікацыі, дзе людзі могуць сустракацца і зручна размяшчацца на скульптурных літарах.

Лакальныя асаблівасці кожнага з шасці рэгіёнаў будуць паказаныя праз колер інсталяцый — ідэя праекта базіруецца на канцэпцыі нацыянальных колеравых пераваг, распрацаванай выдатным дызайнерам, мастаком і паэтам Міхаілам Анемпадыставым у кнізе «Колер Беларусі», а таксама на даследаваннях найбуйнейшага беларускага этнографа Міхаіла Раманюка, які рэканструяваў колеры традыцыйных народных строяў розных рэгіёнаў Беларусі.

Паколькі Мінск — геаграфічны, сацыяльны і культурны цэнтр краіны, дзе перамяшаныя асаблівасці ўсіх рэгіёнаў, гэта будзе адлюстравана з дапамогай усіх асноўных колераў, якія характарызуюць нашу краіну, — сіняга, зялёнага, жоўтага, чырвонага і чорнага. Месца размяшчэння інсталяцыі ў сталіцы яшчэ ўдакладняецца.

— Чорны і чырвоны — базавыя колеры кожнага з арт-аб'ектаў, і яны будуць выкарыстаныя ва ўсіх гарадах. Астатнія адценні абсалютна розныя — яны падкрэсліваюць адметнасці кожнага рэгіёна. Усе колеры выбраны невыпадкова — пры распрацоўцы іх спалучэнняў улічвалася мноства ўнікальных мясцовых асаблівасцяў — напрыклад, прыродных: зеляніна паркаў Гомельшчыны, шэрань Палескіх балот, блакіт азёр Віцебшчыны, — патлумачыў Павел Вайніцкі.

Такім чынам, для інсталяцыі ў Брэсце выбрана спалучэнне зялёнага, розных адценняў сіняга, чырвонага і чорнага. Там яна будзе ўсталявана на перасячэнні вуліцы Савецкай і набярэжнай Францыска Скарыны. «МОВА» ў Віцебску, выкананая ў характэрных колерах творчага аб'яднання УНОВИС, з'явіцца перад мостам 1000-годдзя. Арт-аб'екты ў Гродне будуць жоўтага, розных адценняў сіняга, чырвонага і чорнага колераў — іх плануецца размясціць на Савецкай плошчы. На вуліцы Кірава ў Гомелі ўсталююць кампазіцыю з блакітнай, жоўтай, шэрай, чырвонай і чорнай літар. На Траецкай набярэжнай Магілёва — зялёнай, блакітнай, жоўтай, чырвонай і чорнай.

— Праект закліканы папулярызаваць родную мову, па-новаму раскрыць семантыку беларускага слова з дапамогай арт-аб'ектаў. Яго ўнікальнасць — у спалучэнні з утылітарнай і мастацкай функцыямі трохмерных інсталяцый. Асобна варта адзначыць вялікі турыстычны патэнцыял праекта для ўсіх гарадоў, дзе кампазіцыі будуць усталяваны, — адзначыў **ініцыятар праекта «Веліч роднай мовы» Захар ДУДЗІНСКІ.**

Ва ўсіх гарадах арт-аб'екты з'явяцца вясной.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Два тыдні на дзеючай АЭС

**Выпускнікі БНТУ два тыдні праходзілі вытворчую практыку на Смаленскай атамнай электрастанцыі ў межах беларускай дзяржпраграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2016—2020 гады. За сем гадоў расійскія спецыялісты падрыхтавалі больш за 50 беларускіх атамшчыкаў і штогод прымаюць на практыку да 150 студэнтаў.**

На Смаленскай станцыі гэта ўжо пятая група юных ядзершчыкаў з Беларусі. Падчас практыкі студэнты засвойваюць спецыфіку вытворчасці атамнай электраэнергіі, вывучаюць канструкцыю рэактара, цеплавую схему станцыі, паратурбінныя ўстаноўкі. Усё гэта карысна не толькі добрай падрыхтоўкай да дыпломy, але і магчымасцю пазнаёміцца са спецыфікай дзеючай вытворчасці, упэўнены ў БНТУ. Многія з сённяшніх выпускнікоў — гэта заўтрашнія супрацоўнікі Беларускай АЭС.

**Ірына СІДАРОК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## «Кітайскі Давос» адкладзены з-за каранавіруса




Кітай з прычыны ўспышкі новага каранавіруса адклаў правядзенне штогадовага міжнароднага эканамічнага форуму ў Боаа на востраве Хайнань, вядомага як «кітайскі Давос». Пра гэта паведаміла South China Morning Post са спасылкай на інфармаваныя крыніцы. Меркавалася, што форум пройдзе з 24 да 27 сакавіка. Таксама з-за ўспышкі каранавіруса раней адмянілі сесію Усекітайскага сходу народных прадстаўнікоў (УСНП), якая павінна была пачацца 5 сакавіка. Раней арганізатары Кітайскага форуму развіцця аб'явілі, што пераносяць мерапрыемства на пазнейшы тэрмін.

## У Афганістане ўведзены рэжым зніжэння ўзроўню гвалту



Улады Афганістана і радыкальны рух «Талібан» дамовіліся аб рэжыме зніжэння ўзроўню гвалту ў Афганістане, які ўступіў у сілу апоўначы з пятніцы на суботу. Пра гэта паведаміў тэлеканал TOLOnews са спасылкай на Савет па нацыянальнай бяспецы краіны.

«План заключаецца ў тым, што гэтая фаза пачнецца ў суботу, і ўрад Афганістана гатовы скарыстацца такой магчымасцю», — цытуе тэлеканал прадстаўніка савета. Па звестках крыніц TOLOnews, «Талібан» абавязаўся спыніць атакі на гарады, аўтамагістралі, афганскія і амерыканскія ваенныя базы. У той жа час агенцтва Reuters інфармуе аб тым, што зніжэнне гвалту будзе доўжыцца сем дзён.

## Легендарная «Мелодыя» сышла ў прыватныя рукі



Расмаёмасць прадала АТ «Фірма Мелодыя», якой належыць найбуйнейшы аўдыяархіў краіны, прыватнай кампаніі «Фармакс» за 329,6 млн рублёў (5,1 млн долараў), пішуць «Ведомости» са спасылкай на копію пратакола аўкцыёну. «Фірма Мелодыя» была створана ў 1964 годзе як усесаюзная фірма грамафонных пласцінак і да гэтага часу належала дзяржаве. У фанатэцы кампаніі амаль 240 тысяч аўдыятвораў на аналагавых стужках, вінілавых пласцінках, цвёрдых дысках і іншых носьбітах, у тым ліку запісы савецкіх выканаўцаў музыкі і рарытэтныя запісы (напрыклад, галасы Леніна і Маякоўскага).

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 2 (101)



Аты-баты

# На парад — у дзве сталіцы

**У Цэнтральным Доме афіцэраў прайшоў брыфінг, прысвечаны актуальным пытанням дзейнасці Узброеных Сіл. На яго былі запрошаны ваенныя аташэ, акрэдытаваныя пры Міністэрстве абароны Беларусі. Брыфінг праводзіў першы намеснік начальніка Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва ведамства Валерый РАВЕНКА.**

Падчас брыфінгу былі прадстаўлены погляды Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь на пытанні сусветнай і рэгіянальнай бяспекі, міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва, стану, падрыхтоўкі і аснашчэння беларускай арміі. Было адзначана, што ў 2020 годзе найбольшую важнасць для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь прадстаўляюць мерапрыемствы, якія праводзяцца ў гонар 75-годдзя Вялікай Перамогі. Беларускія вайскоўцы возьмуць удзел у парадзе ў Мінску і ў Маскве.

Валерый Равенка падкрэсліў, што Рэспубліка Беларусь строга выконвае ўзятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы і праводзіць ясную, зразумелую і празрыстую ваенную палітыку.

# Сувораўскае запрашае

**29 лютага ў Мінскім сувораўскім ваенным вучылішчы пройдзе Дзень адкрытых дзвярэй.**

У яго праграме прадугледжана сустрэча з камандаваннем вучылішча, азнаямленне з умовамі жыцця і побыту суворацаў, элементамі вучэбна-матэрыяльнай базы. Афіцэры растлумачаць асаблівасці паступлення ва ўстанову ў 2020 годзе.

Начальнікі аддзелаў і службаў, педагогі, медыцынскія работнікі адкажуць на ўсе пытанні, якія датычацца прыёмнай кампаніі, а таксама падачы і афармлення дакументаў.

# Саюзны дэсант

**У Пскоўскай вобласці прайшло тактычнае вучэнне сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл Беларусі і Паветрана-дэсантных войскаў Расіі.**

Было адпрацавана дэсантаванне асабістага складу на аэрадром, захоплены праціўнікам, дзе быў знішчаны кантрольна-дыспетчарскі пункт і баявое ахоўванне. А рэзервовыя сілы ўмоўнага праціўніка былі блакаваны на падыходзе.

Агулам у вучэнні было задзейнічана больш за 400 ваеннаслужачых, каля 100 адзінак баявой тэхнікі пскоўскага гвардзейскага дэсантна-штурмавога злучэння і вайскоўцаў сіл спецыяльнай аперацыі нашай краіны. Таксама ў ім прыняла ўдзел авіяцыя – верталёты Мі-24 і Мі-8АМТШ Заходняй ваеннай акругі і самалёты Іл-76МД ваенна-транспартнай авіяцыі ваенна-касмічных сіл Расіі.

# Сумесна з Сербіяй

**З 19 да 21 лютага ў Рэспубліцы Беларусь з афіцыйным візітам знаходзіцца дэлегацыя Узброеных Сіл Сербіі на чале з міністрам абароны Рэспублікі Сербія Аляксандрам ВУЛІНЫМ, паведамляе прэс-служба Міністэрства абароны нашай краіны.**

Падчас візіту адбыліся перагаворы міністра абароны Рэспублікі Беларусь генерал-маёра Віктара Хрэніна з кіраўніком сербскага абароннага ведамства. Бакі абмяняліся думкамі па актуальных пытаннях міжнароднай бяспекі, а таксама абмеркавалі бягучы стан двухбаковага ваеннага супрацоўніцтва і перспектывы яго развіцця.

Акрамя гэтага, праграмай візіту прадугледжаны сустрэчы дэлегацыі з дзяржаўным сакратаром Савета бяспекі і кіраўніцтвам Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта, а таксама ўдзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, прымеркаваных да святкавання Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Vox populi

# «Армія — школа мужнасці, грамадзянскасці і патрыятызму»

**Паводле сацыялагічнага апытання, з гэтым сцвярджэннем згодны 86 працэнтаў звольненых у запас увосень мінулага года вайскоўцаў тэрміновай службы.**

Як мы ведаем хіба што не з дзяцінства, у арміі загады не абмяркоўваюцца, а выконваюцца. Але за гэтым кароткім выслоўем хаваецца такая рэч, як мікраклімат у падраздзяленні. Ці лёгка будзе яго камандзіру знайсці кантакт з падначаленымі? І наколькі добра будзе працаваць зваротная сувязь? Менавіта таму неадрыўнай часткай працы Узброеных Сіл з'яўляецца ваенная сацыялогія, якая і заклікана шукаць адказы на гэтыя краевугольныя пытанні.

У беларускай арміі Цэнтр псіхалагічных і сацыялагічных даследаванняў быў сфарміраваны ў 2004 годзе. Да таго яго функцыі выконвала створаная некалькі дзясяткаў гадоў таму лабараторыя грамадскага аналізу і сацыялагічных даследаванняў Ваеннай акадэміі. Наша гутарка — з загадчыкам Цэнтра падпалкоўнікам Васілём Караткевічам.

— У 2018 годзе пачалася навукова-даследчая работа, мэтай якой было высветліць, як жа тэрміновая ваенная служба ўплывае на асобу салдата. Гэтае апытанне было суцэльным, у ім паўдзельнічалі ўсе вайскоўцы перад іх звальненнем у запас. Мы даследавалі тое, як на светапогляд уплываюць такія рэчы, як вайсковы калектыў, побытавыя ўмовы, аўтарытэт камандзіра, баявая падрыхтоўка, распарадак дня, арганізацыя вольнага часу. Карацей кажучы, мы распрацоўваем анкетныя матэрыялы, зыходзячы з задач, якія стаяць перад Узброенымі Сіламі.

***— А калі перайсці да лічбаў?***

— Напрыклад, колькасць тых, хто лічыць, што з імі адбыліся станоўчыя змяненні, павялічылася да 86 працэнтаў. Цікава, што мы назіраем істотны рост задаволенасці відамі забеспячэння. Што да побытавых умоў, то цяпер імі задавальняюць 84 % вайскоўцаў супраць 82 % годам раней. Палепшылася і лазнева-пральнае абслугоўванне. Калі станоўчыя адказы датычна яго далі год таму 76 % апытаных, то цяпер іх ужо 83 %. Важна, што ў параўнанні з вынікамі папярэдняга даследавання ў два разы вырасла ступень здаволенасці вайскоўцаў памерам грашовага забеспячэння.

***— Нядаўна сацыёлагі правялі апытанне. Што з атрыманымі вынікамі адбываецца далей?***

— Усе нашы даследаванні — гэта не сухое давядзенне камандаванню лічбаў пра тое ці іншае пытанне. Мы праводзім глыбокі аналіз сітуацыі і па яго выніках выдаём рэкамендацыі аб тым, што ж можна змяніць у лепшы бок. За апошні час у Беларусі былі прыняты два Указы Прэзідэнта, якія скіраваны на паляпшэнне сацыяльнага статусу вайскоўца і прадастаўленне яму прэферэнцый. Былі таксама прыняты змены ў Працоўны і Жыллёвы кодэксы. Фактычна ў канву гэтых дакументаў ляглі думкі, выказаныя салдатамі тэрміновай службы падчас апытання.



Напрыклад, за прадастаўленне льгот пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы тым, хто адслужыў, выказаліся больш за палову апытаных. Яны аргументавалі сваю пазіцыю тым, што падчас службы ў арміі шмат што забываецца. Цяпер яны могуць вучыцца на падрыхтоўчых аддзяленнях і факультэтах даўузаўскай падрыхтоўкі за бюджэтны кошт. Галоўнае — мець рэкамендацыю ад воінскай часці і сярэдні бал не ніжэй за шэсць. Вельмі вострае пытанне палягала ў тым, каб пасля службы ў арміі вярнуцца на ранейшае працоўнае месца незалежна ад формы ўласнасці наймальніка. Шмат хто з салдат зарабляў грошы ў прыватнікаў, а яны без паважных на тое прычын доўга трымаць працоўныя месцы вольнымі не будуць. Цяпер жа працоўнае месца захоўваецца ў любым выпадку.

Зноў жа, пераважная большасць вайскоўцаў выказалася за тое, каб уключыць перыяд службы ў арміі ў страхавы стаж, які будзе аказваць уплыў падчас выхаду на пенсію. У мінулым годзе ў арміі пачаўся пераход на ваенную форму новага ўзору. Адметна, што на гэта таксама паўплывала наша сацыялагічнае апытанне. У лістападзе 2018 года задаволенасць якасцю нашэння, яе трываласцю, камфортам і лёгкасцю прання складала 67 % рэспандэнтаў. Нягледзячы на тое, што атрымліваць новую форму вайскоўцы яшчэ не скончылі (працэс будзе доўжыцца да канца 2020 года), колькасць салдат, якія далі станоўчы адказ датычна якасці абмундзіравання, падскочыла да 76 %. А гэта паказвае на тое, што мы рухаемся ў правільным кірунку.

***— Не менш важнае пытанне і мікраклімату на ўзроўні зносін паміж салдатамі. Фактычна ў адным памяшканні, у адных умовах аказваюцца прадстаўнікі розных сацыяльных груп, якія былі прызваны. Магчыма, у жыцці па-за плотам часці яны ніколі і не перасякуцца...***

— Менавіта для таго нашы псіхолагі і сацыёлагі пачынаюць працаваць з вайскоўцамі з першых жа дзён, як толькі яны пераадзяваюцца ў ваенную форму. Па-першае, гэта звязана з пытаннямі адаптацыі да новых умоў, якія рэзка змяніліся. Звычайна гэты працэс доўжыцца, як правіла, ад месяца да трох. Па-другое, мы вывучаем умовы, якія дапамагаюць самім людзям стаць лепшымі, якія ўплываюць на іх у станоўчы бок. У топ-5 такіх умоў уваходзіць знаходжанне ў мужчынскім калектыве, неабходнасць самастойна прымаць рашэнне, патрабуецца рабіць усё самастойна і максімальна хутка, асаблівыя ўмовы знаходжання, у тым ліку і палявыя, а таксама неабходнасць у першую чаргу разлічваць на сябе.

А калі скласці аналагічны рэйтынг здабыткаў падчас службы ў арміі, то да іх адносяцца ўменне цаніць час, свабоду дзеянняў, большую самастойнасць, новы жыццёвы досвед і глыбокае разуменне такога паняцця, як сяброўства. Іх адзначылі ад чвэрці да паловы апытаных.

***— Ці можаце вы сцвярджаць, што ў нашай арміі не засталося месца для міжасобасных канфліктаў?***

— Адкажу мовай лічбаў: дзевяць з дзесяці ўдзельнікаў апытання выказалі задаволенасць узаемаадносінамі ў салдацкім калектыве, 87 % апытаных адзначылі здаровыя, таварыскія ўзаемаадносіны з непасрэднымі камандзірамі. Гэтыя вынікі на 5-7 % перавышаюць дадзеныя мінулага года. Мы злучаем гэты паказчык з задаволенасцю ўзроўнем арганізацыі заняткаў па баявой падрыхтоўцы, якую выказалі больш трох чвэрцяў звольненых у запас.

***— А якая роля афіцэрскага складу — камандзіраў рот, узводаў — у згуртаванні вайсковых калектываў?***

— Адно з пытанняў анкеты было сфармулявана так: «Ці пашлі б вы са сваім камандзірам у разведку ці ў бой?» І без малога 80 % апытаных са сваім камандзірам гатовыя кінуцца ў бой. Дзякуючы асабістаму прыкладу афіцэраў, мэтанакіраванаму навучальна-выхаваўчаму працэсу 76 % рэспандэнтаў роту прыраўнялі да сваёй сям'і. Чатыры пятых удзельнікаў апытання лічаць сваіх камандзіраў прафесіяналамі ваеннай справы.

У 2017-м годзе мы вырашылі правесці эксперымент. Пэўны пералік пытанняў быў зададзены новаму папаўненню, а калі яно звальнялася ў 2019-м, мы іх паўтарылі. І атрымалася, што тэрміновая служба ўплывае на маладых людзей пазітыўна. Так, на пытанне «Як аднесліся бацькі да вашага прызыву» станоўча адказаў спярша 61 % маладых людзей, а праз паўтара года — ужо 71 %. Рост такога ж паказчыка, так бы мовіць, у асабістай скіраванасці яшчэ большы — з 46 % да 61 %. Павялічваецца і колькасць тых, хто ганарыцца сваёй краінай, — да 78 %. Але на гэта трэба глядзець пад іншым ракурсам. Справа ў тым, што да нас ва ўзросце ад 18 да 27 гадоў прызываюцца ўжо сфарміраваныя асобы. І існуючыя тэндэнцыі адназначна паказваюць на тое, што з патрыятычным выхаваннем да прызыву справы абстаяць не вельмі добра. І трэба ўзмацняць, але рабіць гэта ў адпаведнасці з патрабаваннямі часу.

Сцвярджаючы, што армія — школа мужнасці, грамадзянскасці і патрыятызму, большасць учарашніх салдат і сяржантаў тэрміновай службы ўпэўнены: абарона дзяржавы — абавязак кожнага грамадзяніна.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Беларусь памятае

# САННЫ РЭЙД

## Як партызаны здзейснілі пераможную аперацыю

**Сёлетняя зіма на снег, скажам прама, зусім небагатая. Але ў лютым і сакавіку 1942 года, калі пра глабальнае пацяпленне ніхто і не чуў, снегу было вельмі шмат. Гэтым і скарысталіся партызаны.**

78 гадоў таму на тэрыторыі 23 раёнаў Мінскай, Палескай і Пінскай абласцей БССР звыш 600 партызан Мінскага злучэння сумесна з атрадам Васіля Каржа ажыццявілі кальцавы санны рэйд па тылах нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аперацыя аказалася ўдалай. Партызаны нанеслі адчувальны ўрон ворагу і дэзарганізавалі дзейнасць акупацыйных улад. А дзякуючы масавай агітацыйнай рабоце значна павялічылася колькасць партызанскіх фарміраванняў.

Падрабязны план правядзення вялікага партызанскага рэйду па акупаванай ворагам беларускай тэрыторыі быў дэталёва разгледжаны і прыняты ў снежні 1941-га Мінскім падпольным абкамам Кампартыі Беларусі. Кіраваў аперацыяй аператыўны штаб партызанскага злучэння Мінскай вобласці на чале з адным з выдатных арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху, выхадцам з вёскі Заграддзе Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці Васілём Казловым, які працаваў да вайны намеснікам старшыні Саўнаркама БССР, другім сакратаром Мінскага АК КП(б)Б.

Паўтара месяца ішла ўзмоцненая падрыхтоўка да рэйду. Неабходна было значна папоўніць атрады людзьмі, зброяй, арганізаваць добры санны транспарт. Каб размясціць на ім атрады, якія ўдзельнічалі ў рэйдзе, трэба было здабыць 600 прылад. Акрамя таго, вырашылі сфарміраваць кавалерыйскі атрад, а для яго таксама патрэбны коні, сёдлы і аброці. Усе гэтыя пытанні абмяркоўваліся разам з калгасным актывам.

Савецкія патрыёты прыйшлі на дапамогу: аддавалі партызанскім атрадам схаваных у лесе коней, інвентар, вупраж, фураж. Нярэдка разам з коньмі ў атрады прыбывалі і мясцовыя жыхары. У пасляваенны час Васіль Казлоў падрабязна напісаў пра гэтыя падзеі ў мемуарах «Людзі адмысловага складу», выдадзеных выдавецтвам «Маладая гвардыя».

Частку атрадаў на Любаншчыне, у Акцябрскім, Капаткевіцкім, Асіповіцкім, Рудзенскім і некаторых іншых раёнах было вырашана пакінуць на месцы. Перад атрадамі ставілася задача стрымліваць сілы ворага і дапамагаць савецкім рэйду, які праходзіў праз іх тэрыторыю. Паводле ўспамінаў Васіля Казлова, у рэйдзе ўдзельнічалі партызанскія атрады, сфарміраваныя на тэрыторыі Любанскага, Старобінскага, Старадарожскага і Глускага раёнаў. Атрады ўзначальвалі вопытныя камандзіры.

Перадавым ішоў Старобінскі атрад «Камарова» пад камандаваннем Васіля Каржа. Ён сфарміраваў адзін з першых у Беларусі партызанскіх атрадаў і ўжо меў



баявы досвед: яшчэ ў 1920-х гадах удзельнічаў у партызанскай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў атрадзе легендарнага Кірыла Арлоўскага, затым быў камандзірам інтэрнацыянальнага партызанскага атрада ў нацыянальна-рэвалюцыйнай вайне ў Іспаніі.

У рэйд адправіліся амаль усе члены Мінскага абкама КП(б)Б. Сакратар Мінскага падпольнага абкама партыі Раман Навумавіч Мачульскі ў мемуарах «Вечны агонь. Партызанскія запіскі» піша: «Наступіў першы дзень рэйду. Камандзіры апошні раз праверылі экіпіроўку атрадаў: байцы добра апранутыя, зброя ва ўсіх у парадку, на санях выкладзеныя скрыні з патронамі і гранатамі, ляжаць добра накрытыя медыкаменты. У гаспадарчых узводах пагружаныя на сані запасы харчавання. Іван Дзянісавіч Варвашэня яшчэ раз праглядае сваю «гаспадарку»: ці ўсё ўзята для паходнай друкарні, ці добра спакаваныя ў сене радыёпрыёмнік і батарэі». Партызанскія калоны рухаліся на пачах, здзяйснялі марш на 25—30 кіламетраў. А ўдзень — адпачынак, масавая работа з насельніцтвам. Камандзіры, камісары, актывісты атрадаў выступалі з дакладамі, агітатары праводзілі гутаркі, гучную чытку лістовак. У кожнай вёсцы абавязкова ладзілі калектыўнае радыёслуханне».

Першай аперацыяй рэйду быў разгром нямецка-паліцэйскага гарнізона на станцыі Пастылы Жыткавіцкага раёна. Васіль Казлоў паказаў камандзірам іх маршруты, яшчэ раз растлумачыў абавязкі кожнага атрада. З гарнізонам справіліся параўнальна хутка. У баі было знішчана больш за сотню гітлераўцаў, частка акупантаў і паліцаяў здалася ў палон. Сотні тон нарабаванага збожжа раздалі насельніцтву. Потым былі баі ў Доўгім, дзе стаяў вялікі нямецкі гарнізон. У Старобінскім і Ленінскім раёнах прастаялі некалькі сутак. У многіх вёсках, праз якія праязджалі, былі нямецка-паліцэйскія пункты, аднак паліцэйскія не наважваліся выступаць супраць народных мсціўцаў, якіх баяліся як агню, разбягаліся і хаваліся. Паўсюдна разляцеліся чуткі, што вялікае злучэнне Чырвонай Арміі перайшло лінію фронту, яно прасоўваецца па тылах ворага і бязлітасна знішчае фашыстаў і іх прыслужнікаў. Некаторыя гарнізоны праціўніка, пачуўшы пра набліжэнне партызанскіх калон, разбягаліся без бою, як, напрыклад, гарнізоны ў Краснай Слабадзе, Старобіне. У Капыльскім раёне доўга не затрымліваліся, дапамаглі разграміць нямецкія гарнізоны ў раённым цэнтры і на станцыі Цімкавічы, а астатнія разбегліся.



Як успамінаў Васіль Казлоў, у рэйдзе вазілі з сабой партатыўную паходную друкарню, некалькі пішучых машынак. На прывалах выпускалі лістоўкі, звароты абкама да насельніцтва, зводкі Саўінфармбюро. У сотнях асобнікаў разыходзіліся яны па вёсках і гарадах і клікалі людзей на барацьбу. У адной з улётак, выпушчаных у той час, гаварылася: «Набліжаецца час вызвалення беларускай зямлі ад фашысцкай нечысці, і калі беларускі народ зноў зажыве шчасліва і радасна. Усе, як адзін, на барацьбу з ворагам! Арганізуйцеся ў партызанскія атрады. Усімі спосабамі дапамагайце Чырвонай Арміі і партызанам граміць ворага. Наша справа справядлівая, мы пераможам!»

У Баранавіцкай вобласці знішчылі каля дзясятка нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў. Прайшлі праз Нясвіж, Гарадзею, каля самых Стоўбцаў. Адтуль праз Дзяржынскі і Уздзенскі раёны накіраваліся на Грэск. Разам з атрадамі Уладзіміра Зайца захапілі былы ваенны гарадок Канюхі з усім узбраеннем і маёмасцю. У палон узялі некалькі дзясяткаў гітлераўцаў і паліцэйскіх. Аўтарытэт Грэскага партызанскага атрада настолькі ўзрос, што насельніцтва, асабліва моладзь, уступала ў партызаны групамі. Праз некаторы час у Грэскім раёне былі арганізаваны дзве брыгады.



Падчас рэйду пачалі збор сродкаў на ўзбраенне Чырвонай Арміі. Насельніцтва з энтузіязмам аддавала свае зберажэнні: грошы, аблігацыі, каштоўныя рэчы. Было прапанавана накіраваць сабраныя працаўнікамі Мінска і Мінскай вобласці, партызанамі і партызанкамі сродкі на вытворчасць самалётаў «Партызан Мінска», «Партызан Слуцка», «Партызан Барысава». Вярхоўны Галоўнакамандуючы тэлеграмай горача падзякаваў жыхарам БССР і партызанам і перадаў братэрскае прывітанне і падзяку Чырвонай Арміі. Лістоўкі з тэкстам урадавай тэлеграмы абкамам партыі былі выпушчаны вялікім тыражом і разышліся па ўсіх абласцях краіны.

У раёне Слуцка партызаны разбілі некалькі варожых гарнізонаў, разбурылі амаль усе масты праз Случ, спалілі нафтабазу, прывялі ў непрыдатнасць чыгуначную лінію. Атрады партызан, якіх пераследавалі буйныя фашысцкія часці, адышлі да Старых Дарог і Асіповіч, дзе быў вялікі чыгуначны вузел. Прайшлі яшчэ праз Парычы, Шацілкі, Азарыцкі раён, пабывалі ў Капаткевічах, Петрыкаве. У сувязі з тым што пачыналася вясновая бездараж, дарогі разбухлі, у нізінах зацурчэлі ручаі, штаб злучэння 2 красавіка 1942 года аддаў партызанскім атрадам загад вяртацца на свае ранейшыя базы.

Васіль Казлоў высока ацаніў партызанскі рэйд. У мемуарах ён напісаў: «Першы рэйд па Беларусі прынёс вялізную карысць. Ён умацаваў сувязь з масамі, узняў аўтарытэт партызанскага руху і амаль падвоіў колькасць байцоў. Мы пабывалі ў раёнах, з якімі раней падтрымлівалі сувязь толькі праз сувязных, і ўстанавілі непасрэдны кантакт з падпольнымі райкамамі, партарганізацыямі і групамі. У многіх раёнах Мінскай і сумежных абласцей мы фактычна сталі гаспадарамі».

Санны рэйд партызан адлюстраваны ў комплексе адной з залаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Тут у вітрынах размешчаны: бінокль і кавалерыйская нагайка камандзіра партызанскага атрада «Камарова» Пінскай вобласці Васіля Каржа, баявыя ўзнагароды, зброя, фатаграфіі і асабістыя рэчы некаторых удзельнікаў рэйду, лістоўкі Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б 1942 года.

Вядомая аперацыя партызан адлюстравана таксама ў палатне «Перад рэйдам па тылах ворага» заслужанага дзеяча мастацтваў БССР, удзельніка партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны Сяргея Раманава. Сёння карціна захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспубліцы Беларусь.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении открытого аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

**Организатор аукциона:** комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета, г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, конт. тел.: (017) 222 44 69, (017) 200 20 89, (017) 200 16 08.
Аукцион состоится **25 марта 2020 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
На аукцион выставляются:

| | **ЛОТ № 1** | **ЛОТ № 2** |
|---|---|---|
| **Сведения о предмете аукциона, место нахождения имущества** | Имущество по ул. Уборевича, 109 в г. Минске и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для обслуживания недвижимого имущества.<br>В состав имущества входят:<br>***недвижимое имущество:***<br>- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1009559 (наименование – стационарная автогазозаправочная станция), расположенное в г. Минске по ул. Уборевича, 109, общая площадь здания АГЗС составляет 39,6 кв. м, год постройки – 2009;<br>составные части и принадлежности: технологический трубопровод СУГ к технологическому оборудованию, проезд, площадки, пешеходная дорожка и бордюр 0,08, очистные сооружения, сети хозяйственно-бытовой и ливневой канализации, резервуары СГУ (закрытая площадка резервуаров СУГ), ограждение, два резервуара, хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, кабельная сеть наружного освещения, кабельная линия, газопровод;<br>- газон;<br>***движимое имущество, относящееся к основным средствам:***<br>- насос SKC 4.08.5.1160 LPG, система видеонаблюдения, машина электр. контрольно-кассовая МСК-4, две топливораздаточные колонки 6000Р, измеритель плотности, комплект АИИСУТПОН Берлио, два шкафа для инвентаря ШКИ-1700.900.1950, сервис-блок ДС105 с электронным интерфейсом, декоративно-рекламное оформление, внеплощадочные сети электроснабжения, внеплощадочные сети связи | Имущество по ул. Наполеона Орды, 10 в г. Минске и право заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для обслуживания недвижимого имущества.<br>В состав имущества входят:<br>***недвижимое имущество:***<br>- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1014570 (наименование – стационарная автогазозаправочная станция), расположенное в г. Минске по ул. Наполеона Орды, 10, общая площадь здания АГЗС составляет 50,7 кв. м, год постройки – 2012;<br>составные части и принадлежности: технологический трубопровод, технологический трубопровод СУГ к технологическому оборудованию, телефонная канализация, въезд и проезд, дорожка и площадки, очистное сооружение, информационный щит, стела, ливневая канализационная сеть, ограждение резервуарного парка, ограждение площадки под мусоросборники, два резервуара, ворота, контрольный кабель, сеть наружного освещения, внутриплощадные сети электроснабжения, хозяйственно-питьевая водопроводная сеть, хозяйственно-фекальная канализационная сеть, газон, сеть видеонаблюдения;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1019766, расположенное в г. Минске по ул. Наполеона Орды, 10; протяженность газопровода – 93 м, год постройки – 2012;<br>***движимое имущество, относящееся к основным средствам:***<br>- внеплощадные сети электроснабжения, внутриплощадные сети автоматизации, два насосных агрегата corken fd-150, сервис-блок ДС 105, топочная, система видеонаблюдения, две колонки раздаточных pg-6000p, система измерительная «Струна», пожарная сигнализация, терминал кассовый «БИС-2000» с ППП «АРМ оператора АЗС» вер.9, оборудование системы АИИСУ ОН Берлио, сейф типа СМ КС |
| **Начальная цена предмета аукциона** | 2 483 847 рублей 80 копеек, из них: начальная цена недвижимого имущества – 2 380 697 рублей 51 копейка, начальная цена движимого имущества, относящегося к основным средствам, – 11 860 рублей 52 копейки, начальная цена права заключения договоров аренды земельных участков – 91 289 рублей 77 копеек | 2 045 531 рубль 70 копеек, из них: начальная цена недвижимого имущества – 1 943 334 рубля 83 копейки, начальная цена движимого имущества, относящегося к основным средствам, – 39 113 рублей 77 копеек, начальная цена права заключения договоров аренды земельных участков – 63 083 рубля 10 копеек |
| **Продавец недвижимого имущества** | Производственное республиканское унитарное предприятие «МИНГАЗ», тел.: (017) 299 28 06.<br>Осмотр имущества потенциальными покупателями производится с участием представителей продавца – Кашубы Дмитрия Александровича, конт. тел. (029) 699 59 94 | |
| **Информация о земельных участках для обслуживания продаваемого недвижимого имущества** | земельный участок площадью 0,3773 га с кадастровым номером 500000000002003108, в том числе с ограничениями в использовании земель: 0,0432 га – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; 0,0034 га – охранная зона линий связи и радиофикации; 0,0472 га – охранная зона сетей и сооружений канализации;<br>вид вещного права на земельный участок – право аренды, срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признании аукциона несостоявшимся | земельный участок площадью 0,1878 га с кадастровым номером 500000000005007084, в том числе с ограничениями в использовании земель: 0,0110 га – охранная зона линий связи и радиофикации; 0, 0048 га – охранная зона линий электропередачи; 0,0269 – охранная зона сетей и сооружений водоснабжения; 0,0334 га – охранная зона сетей и сооружений канализации, 0,0004 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, земельные участки площадью 0,0204 га с кадастровыми номерами 500000000005007085 и 500000000005007086 (в красных линиях), в том числе с ограничениями в использовании земель: 0,0117 га – охранная зона линий электропередачи; 0,0194 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения; 0,0010 га – охранная зона сетей и сооружений канализации |
| **Условия, связанные с использованием земельных участков, а также иные условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона** | Направление возможного использования земельного участка – согласно регламентам генерального плана г. Минска, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 23 апреля 2003 г. № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации», земельный участок по ул. Уборевича, 109 находится в зоне жилой многоквартирной застройки (109Жм). В соответствии с градостроительным проектом детального планирования в границах ул. Чижевских – граница ландшафтно-рекреационной зоны 125ЛР-2 – ул. Голодеда – ул. Ташкентская – ул. Уборевича – МКАД (внесение изменений), утвержденным решением Мингорисполкома от 5 июля 2019 г. № 1936, земельный участок по ул. Уборевича, 109 находится в границах коммунально-обслуживающей территории (П4-ко), предлагается сохранение автозаправочной станции, ул. Уборевича, 109 (РУП «МИНГАЗ»).<br>Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:<br>- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признании аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Мингорисполкомом рассрочки ее внесения);<br>- в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него;<br>- обеспечить пользование предоставленным земельным участком в соответствии с целевым назначением и условиями его предоставления, осуществлять комплекс мероприятий по охране земель;<br>- вносить арендную плату в соответствии с действующим законодательством;<br>- земельный участок, предоставленный в аренду, по миновании надобности, но не позднее срока, на который он предоставлен, возвратить в состав земель города Минска в состоянии, пригодном для дальнейшего использования по назначению, путем направления в Мингорисполком соответствующего ходатайства или в случае необходимости продлить срок аренды им, обратившись в Мингорисполком не позднее чем за три месяца до окончания установленного срока;<br>- при продлении срока аренды земельного участка до истечения срока аренды обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией продления права | Направление возможного использования земельных участков – согласно регламентам генерального плана г. Минска, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 23 апреля 2003 г. № 165 «Об утверждении генерального плана г. Минска и некоторых вопросах его реализации», земельные участки по ул. Наполеона Орды, 10 находятся в зоне жилой многоквартирной застройки (165Жм). В соответствии с градостроительным проектом детального планирования жилого района Дружба (Брилевичи) в границах пр-т Дзержинского – МКАД – ж/д Лошицкая водная система (внесение изменений), утвержденным решением Мингорисполкома от 3 марта 2016 г. № 555, земельные участки по ул. Наполеона Орды, 10 находятся в границах коммунально-обслуживающей территории районного значения, предлагается сохранение автоматизированной газозаправочной станции.<br>Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:<br>- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона или признании аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества несостоявшимся внести плату за право заключения договора аренды земельных участков (часть платы – в случае предоставления Мингорисполкомом рассрочки ее внесения);<br>- в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельных участков обратиться в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельных участков, прав, ограничений (обременений) прав на них;<br>- обеспечить пользование предоставленными земельными участками в соответствии с целевым назначением и условиями их предоставления, осуществлять комплекс мероприятий по охране земель;<br>- вносить арендную плату в соответствии с действующим законодательством;<br>- земельные участки, предоставленные в аренду, по миновании надобности, но не позднее срока, на который они предоставлены, возвратить в состав земель города Минска в состоянии, пригодном для дальнейшего использования по назначению, путем направления в Мингорисполком соответствующего ходатайства или в случае необходимости продлить срок аренды ими, обратившись в Мингорисполком не позднее чем за три месяца до окончания установленного срока;<br>- при продлении срока аренды земельных участков до истечения срока аренды обратиться в установленном порядке за государственной регистрацией продления права. |
| **Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета** | 496 000 рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13AKBB36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитета государственного имущества Мингорисполкома, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе** | 409 000 рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13AKBB36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитета государственного имущества Мингорисполкома, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе** |

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 23 марта 2020 г. до 16.00.**

Для участия в аукционе организатору аукциона подается заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:
- копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;
- сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

По заявлению победителя аукциона (единственного участника несостоявшегося аукциона) Минским городским исполнительным комитетом предоставляется рассрочка внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков. Указанное заявление подается победителем аукциона (единственным участником несостоявшегося аукциона) в Минский городской исполнительный комитет не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона (далее – протокол). Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков принимается Минским городским исполнительным комитетом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

Рассрочка внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков предоставляется в порядке, установленном решением Минского городского исполнительного комитета от 30.04.2009 № 1015 «Об утверждении Инструкции о порядке внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским городским исполнительным комитетом) за право заключения договоров аренды земельных участков, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельных участков. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (единственным участником несостоявшегося аукциона) указанных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в Минский городской исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи имущества. В тот же срок Минский городской исполнительный комитет передает победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) выписку из решений об изъятии земельных участков и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает экземпляр протокола и заключает с ним договора аренды земельных участков.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества на срок не более одного года со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей может быть предоставлена при заключении договора купли-продажи по решению продавца по согласованию с соответствующим государственным органом.

Информация об аукционе и предмете аукциона дополнительно размещена на официальных интернет-порталах Минского городского исполнительного комитета (**www.minsk.gov.by**) и государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (**www. gki.gov.by**)

# Беларуская, руская, сусветная...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Першапачаткова наш круглы стол задумваўся як батл паміж тымі, хто грудзьмі стаіць за рускую літаратуру і ганьбіць беларускую, і тымі, хто адстойвае гонар менавіта беларускай літаратуры. Ці раўназначныя яны ў школьнай праграме? Ці можна іх параўноўваць? А калі можна, то па якой шкале? На якую мову трэба перакладаць Роўлінг і Муракамі? Мы прыдумалі яшчэ шмат пытанняў, але чым далей паглыбляліся ў праблематыку, тым больш відавочным станавілася, што задуманы батл недарэчны, бо культура павінна аб'ядноўваць, — канстатуюць Яўгенія і Андрэй. — Таму мы хочам пагаварыць менавіта пра гэта. Як, ведаючы чужое, не страціць сваё? Як адчуць сябе часткай вялізнага літаратурнага свету, а не яго задворкамі?



**Андрэй ЖВАЛЕЎСКІ і Яўгенія ПАСТЭРНАК: «На якую мову трэба перакладаць Роўлінг і Муракамі? Як адчуць сябе часткай вялізнага літаратурнага свету?»**

## ЧЫЕ КАШТОЎНАСЦІ ТРАНСЛЮЕМ?

**Пісьменніца і даследчык беларускай літаратуры Ганна СЕВЯРЫНЕЦ** вывучала ў Беларускім дзяржаўным універсітэце рускую філалогію, а цяпер выкладае ў Смалявіцкай гімназіі менавіта рускую мову і літаратуру.

— Я вырасла з глыбокім комплексам, што я беларуска, — прызнаецца яна, — што ў нас няма ні прыгожай прыроды, ні сваіх бяроз, ні нармальных паэтаў, таму што тое, што нам прапаноўвалі чытаць у школе ў рамках беларускай літаратуры, было зусім мне не цікавым. Затое я любіла рускую літаратуру. А потым ва ўніверсітэце адкрыла для сябе, што існуюць яшчэ і нямецкая, французская, іспанская, лацінаамерыканская выдатныя літаратуры.

**«Патрыятызм — гэта разуменне таго, што твая культура жывая, літаратура — жывая і пісьменнікі жывыя».**

Думаю, што не трэба сёння класці на вагі рускую і беларускую літаратуру і параўноўваць, якая з іх больш годная. Праблема заключаецца насамрэч у тым, якім чынам руская культура ўваходзіць у свядомасць беларускіх школьнікаў, якія адзінкі культурнай інфармацыі, якія канцэпты і фармулёўкі закладваюцца ім у галаву. Прывяду толькі некалькі красамоўных прыкладаў з практыкі выкладання рускай мовы і літаратуры ў беларускай школе. Так, у зборніку пераказаў для выпускнікоў у адным з тэкстаў, што прапануюцца адзінаццацікласнікам, сказана, што першы славянскі першадрукар — гэта Іван Фёдараў. Хачу заўважыць, што пераказ — такая форма работы, пры якой тое, што ты пачуў на слых і аднавіў потым у пісьмовай форме, застаецца ў тваёй галаве назаўсёды. Я не ведаю, чаму нашы суседзі дазваляюць сабе такое скажэнне гістарычных фактаў, але мы дакладна ведаем, чый вучань Іван Фёдараў і ў каго ён узяў друкарскую тэхналогію. У шостым класе таксама ёсць практыкаванне, прысвечанае першадрукару Івану Фёдараву, дзе Францыск Скарына нават не згадваецца, а рэцэнзенты гэтага падручніка — настаўнікі гімназіі імя Францыска Скарыны...

На ўроках рускай мовы ўвогуле адсутнічае беларуская тапаніміка. У практыкаваннях сустракаюцца Масква-рака, Піцер-прыгажун, Волга-матушка... «У нас ёсць Міхайлаўскае, Ясная Паляна. Напішыце, калі ласка, што вы думаеце пра гэтыя куточкі роднай зямлі», — прапануюць аўтары падручніка беларускім вучням. Мы выкладаем рускую мову так, быццам бы жывём у Расіі. А дзе Мазыр, Магілёў, Гомель у падручніках для нацыянальнай школы? Настаўнікі, не задумваючыся, паўтараюць: «Наш Пётр першы», «Наш Суvotraў». Прабачце, але для беларусаў гэтыя гістарычныя персоны зусім не нашы... Я ўпэўнена, што вывучаючы рускую мову як мову, на якой пакуль размаўляе большасць насельніцтва ў нашай краіне, мы павінны напаўняць гэтыя ўрокі беларускім зместам, беларускімі прыкладамі і гістарычнымі асобамі. Я як настаўнік, які выкладае ў нацыянальнай школе, не магу расслабіцца ні на хвіліну, таму што трэба пастаянна кантраляваць, якія каштоўнасці транслюю дзецям.

Што датычыцца рускай літаратуры, тут перакос, на думку Ганны Севярынец, яшчэ больш заўважны. У рускай літаратуры прапануецца вельмі шмат тэкстаў, у якіх дзяцей прагрaмуюць на тое, што руская прырода — самая прыгожая: рускія бярозы, рускія рэкі і азёры...

— Мы чытаем пра тое, што самыя лепшыя — рускі чалавек і рускі салдат. Гэта пішуць рускія пісьменнікі і яны маюць права думаць, што руская бяроза — самая прыгожая ў свеце. Але калі мы кажам пра касмапалітычнасць у выкладанні літаратуры, так давайце вывучаць у школе таксама французскіх, нямецкіх, фінскіх паэтаў, каб нашы дзеці разумелі, што свет разнастайны і не замыкаецца толькі на рускай літаратуры. Між іншым, школьная праграма па рускай літаратуры фарміравалася з сярэдзіны XIX стагоддзя і істотна не змянялася. Напрыклад, паэма Міхаіла Лермантава «Мцыры» знаходзіцца там з 1845 года, «Яўгеній Анегін» Пушкіна — з 1841 года. Гэта залатая класіка рускай літаратуры. А мы побач з ёй ставім нашу нацыянальную літаратуру, якая выглядае не лепшым чынам. Давайце ўявім сабе, што з рускай літаратуры ўзялі б і выкінулі Пушкіна і пакінулі там толькі «Клеветникам России», як у нас ад Янкі Купалы пакідаюць толькі «Я мужык-беларус». Выкінулі б цалкам Барыса Пастэрнака, як у нас выкінуты Юлій Таўбін. Я цяпер называю супастаўляльных па стылістыцы, маштабе ўздзеяння і велічыні таленту пісьменнікаў. Выкінулі б цалкам Сяргея Ясеніна, як у нас выкінуты Тодар Кляшторны. Выкінулі б Міхаіла Булгакава, як у нас выкінуты Міхась Зарэцкі.

## КЛАСІКІ ЦІ СУЧАСНЫЯ АЎТАРЫ?

— Як маці, мне хацелася б, каб у школе вывучалася сусветная літаратура, а не толькі руская. Ёсць выдатная скандынаўская літаратура, якая па сваім змесце, дынаміцы падачы тэксту вельмі блізкая сучасным дзецям, — кажа **аўтар і кіраўнік кніжнага праекта «Куфэрак дзіцячых кніг» Таццяна СЛАВІНСКАЯ-ПУЗЫРЭВІЧ.** — Мы сем гадоў прасоўваем сучасную інтэлектуальную літаратуру для дзяцей і падлеткаў. Аўдыторыя бацькоў, якія прыходзяць да нас па кнігі — гэта людзі, у якіх не адна вышэйшая адукацыя і якія размаўляюць сама менеі на адной замежнай мове. Яны выдатна ведаюць і беларускую мову, і з лёгкасцю на яе пераходзяць. Іх дзеці яшчэ ў пачатковай школе прачыталі ўсе асноўныя кніжкі выдавецтваў «Самакат» і «КомпасГід». Дык вось з падобнымі кніжкамі на беларускай мове ёсць праблемы. Белетрыстыка, дзіцячыя дэтэктывы, фэнтэзі... Такой літаратуры не хапае. Дзякуючы невялікаму прыватнаму выдавецтву «Коска», якое спецыялізуецца на дзіцячай і падлеткавай літаратуры, па-беларуску загаварылі такія любімыя многімі дзецьмі персанажы, як Мама Му, Пэтсан і Фіндус, Біла з Болаю і Ёрдзіс. Але Надзея Кандрусевіч не толькі перакладае кнігі са шведскай мовы і выдае іх, яна вымушана сама выкупляць на іх аўтарскія правы, дзяржава ёй у гэтым не дапамагае. І «Коска» ў пэўнай ступені сацыяльны, а не камерцыйны праект. Так, у нас сталі з'яўляцца апошнім часам цікавыя аўтары, якія пішуць для дзяцей кнігі на роднай мове. Але пакуль іх не так шмат, як хацелася б. Таму я думаю, што трэба як мага больш кніг перакладаць на беларускую мову з сучаснай еўрапейскай літаратуры. Перакладная літаратура не канкуруе з беларускай, а штурхае яе да развіцця.

Хачу, каб мой сын ведаў класічную рускую літаратуру, але руская літаратура павінна выкладацца ў кантэксце сусветнай. Што датычыцца беларускай мовы і літаратуры (а мой сын вучыцца цяпер у трэцім класе), то да падручнікаў ёсць шмат пытанняў. Нам вельмі пашанцавала з настаўнікам. Мы набываем сваім дзецям цэлы стос рабочых сшыткаў, дзе прапануюцца зусім іншыя тэксты, настаўніца рыхтуе дзецям заданні на картках. Я не ўяўляю сабе, колькі намаганняў гэта патрабуе, затое беларуская мова не выклікае ў вучняў непрыняцця. І літаратуру для чытання яна прапануе тую, якая цікавая дзецям.

— Я вельмі люблю рускую літаратуру, бо вырасла на ёй і свае кнігі пішу на рускай мове, але мушу прызнаць, што сітуацыя ў школе насамрэч дзіўная, — разважае **Марыя БЯРШАДСКАЯ, дзіцячы пісьменнік, сцэнарыст і настаўнік рускай мовы і літаратуры.** — Чаму, калі мы вывучаем рамантызм, не чытаем апавяданні Эдгара По ці Гофмана? Калі кажам пра балады, то не вывучаем англійскія і шатландскія народныя балады? У старшых класах можна чытаць з дзецьмі «Над пропастью во ржи» ці «Убить пересмешника» Харпер Лі, творы Брэдбеpы, Хэмінгуэя, Борхеса, Оруэла. У праграме вельмі шмат сумных вершаў аб прыродзе — атрымліваецца нейкая бясконцая «Песня аратага» ці «Песня касца», што не чапляе сучасных дзяцей. А чаму б не знаёміць іх з японскай паэзіяй без рыфмаў? Трэба паказваць дзецям розную літаратуру. Прычым, мае вучні не ўспрымаюць рускую літаратуру як сваю. Гэта мы выраслі ў Савецкім Саюзе, а для іх руская літаратура — замежная, і гэта нармальна. Паверце, калі мы прыбяром са школьнай праграмы «Тараса Бульбу» Гогаля, то свет не абрынецца. І калі там стане менш твораў пра XIX стагоддзе, дзеці будуць нам за гэта толькі ўдзячныя. Не толькі беларускую літаратуру хочацца зрабіць больш сучаснай, але і рускую. Я прапанавала б больш чытаць у школе сучасных расійскіх аўтараў.

## ЖЫВЫЯ І МАЛАДЫЯ!

— У мае школьныя гады быў вельмі моцны піетэт перад пісьменнікамі! Мы лічылі, што ўсе яны даўно памерлі, таму трэба пайсці да іх на магілу, пакланіцца і прынесці ім кветкі, — усміхаецца **настаўніца рускай мовы і літаратуры маскоўскай школы № 734 імя Аляксандра Тубельскага, дзіцячы пісьменнік Кацярына ЦІМАШПОЛЬСКАЯ.** — Прыкладна такія ж думкі былі ў мяне, калі я прыйшла працаваць у школу. Затым быў вялікі перапынак, і калі я сем гадоў таму зноў нечакана вярнулася ў школу, то зразумела, што карціна не змянілася і зноў хочацца пайсці пакланіцца магілам пісьменнікаў. Але затым у маім жыцці пачалі адбывацца змены, я сама пачала пісаць кніжкі для дзяцей. Пазнаёмілася з Андрэем Жвалеўскім і Яўгеніяй Пастэрнак. І раптам прыйшло разуменне, што многія пісьменнікі — жывыя, больш за тое, яны маладыя, і зусім неабавязкова ісці да іх на магілы, з імі можна проста паразмаўляць. Канешне, асоба настаўніка на сто працэнтаў вызначае, што будуць дзеці чытаць і ці будуць чытаць увогуле. Мне вельмі пашанцавала, у мяне ёсць доступ да інфармацыі, я ведаю сучасных пісьменнікаў і знаёмлю з імі сваіх вучняў, у тым ліку і з беларускімі. Магчыма, у нашых настаўнікаў ёсць больш свабоды, ёсць магчымасць выбару падручнікаў і праграм, але я ніколі ў сваім педагагічным жыцці не выкарыстоўвала падручнік ні па рускай мове, ні па рускай літаратуры. Мае вучні чытаюць розных пісьменнікаў, і я не абмяжоўваю іх у выбары таго, што ім чытаць.



**Кацярына ЦІМАШПОЛЬСКАЯ: «Многія пісьменнікі — жывыя, больш таго, яны маладыя, і зусім неабавязкова ісці да іх на магілу, з імі можна проста паразмаўляць».**

— А я як маці хачу падзяліцца сваімі назіраннямі, звязанымі з падачай рускай і беларускай літаратуры ў школе, — кажа **філолаг, выкладчык БДУ Людміла КАМЛЮК-ЯРАШЭНКА.** — Якія тэмы, напрыклад, прапануюць для пазакласнага чытання ў пачатковай школе. Па рускай літаратуры: «Пісьменнікі — казачнікі», «Кнігі рускіх пісьменнікаў-анімалістаў для дзяцей», «Кнігі замежных пісьменнікаў-анімалістаў для дзяцей», кнігі пра раўеснікаў, кнігі Астрыд Ліндгрэн для дзяцей, «Пазнаём свет: кнігі для цікаўных», «Поры года ў творчасці паэтаў-класікаў і паэтаў-сучаснікаў». Па беларускаму чытанню: «Люблю наш край, старонку гэту», «Паэтычны вянок роднаму слову і кнізе», «У дзівосным свеце мастацтва», «Мы ўсе старацца будзем дзеля карысці людзям», «Трэба быць на зямлі гаспадаром», «Ішла вайна народная». Атрымліваецца, што тэмы для пазакласнага чытання па беларускай літаратуры абсалютна далёкія ад культурнага ўзросту і чытацкага вопыту дзяцей, тут няма месца ні гарэзлівасці, ні прыгодам, ні казкам, ні раўеснікам. Больш таго, калі ў тэмах прысутнічаюць цытаты пісьменнікаў, такім чынам адразу праграмуецца камунікатыўная ўстаноўка на дыстанцыю. І нават калі дома дзіця бачыць сучасныя кнігі, то ў школе іх няма. А калі вучань прыносіць на пазакласнае чытанне сучасную кнігу, тая адразу ідзе па руках. І многія здзіўляюцца, што такія кнігі ўвогуле ёсць. Я лічу, што патрыятызм — гэта разуменне таго, што твая культура жывая, літаратура — жывая і пісьменнікі жывыя. І кнігі яны пішуць класныя, іх можна прыносіць у школу, дзяліцца імі з сябрамі і дарыць.

І яшчэ як выкладчык я заўважыла, што ўзровень чытацкага досведу ў настаўнікаў рускай і беларускай літаратуры і студэнтаў, якія навучаюцца на рускай і беларускай філалогіі, — розны. Я не супастаўляю педагагічны вопыт ці прафесійнае майстэрства. Маркую, гэта адбываецца таму, што рускія філолагі ўважліва чыталі і пражывалі літаратуру мадэрнісцкую і яны зразумелі і прынялі, што ёсць іншая літаратура, якая не проста падручнік жыцця, што літаратура можа выконваць не толькі дыдактычную функцыю. А ў будучых настаўнікаў беларускай літаратуры перыяд мадэрнізму выпаў, яго няма ў праграме.

Усе пагадзіліся з думкай, што настаўнік павінен сачыць за тым, як сёння развіваецца паэзія, проза, драматургія, якія новыя імёны з'яўляюцца ў літаратуры. А калі настаўнік сам не чытае і нічым не цікавіцца, то як ён можа заахвоціць да гэтага дзяцей?

— Для таго каб мой чытацкі вопыт не кульгаў, хацелася б яшчэ, каб набыццё беларускай літаратуры, што выдаецца, было настаўніку па кішэні, — выказала пажаданне напрыканцы круглага стала настаўніца гімназіі з невялікага райцэнтра.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Асоба

## Дзяніс РАМАНЮК:

# «Я раблю этнаграфію «дваццаць пятым кадрам»

**ПЫШНЫЯ альбомы, выдадзеныя Дзянісам Раманюком, з задавальненнем трымаюць у хатніх бібліятэках як беларусы, бо адчуваюць гонар за краіну, так і замежнікі, бо невядомую культуру даследуюць праз высакакласны кніжны твор. Па-першае, спадар Дзяніс сабраў у адмысловыя выданні «Беларускія народныя крыжы» і «Беларускія народныя строі» напрацоўкі свайго бацькі, славутага этнографа Міхася Раманюка. Па-другое, працягнуў сваю выдавецкую дзейнасць таксама як фатограф і аўтар, у выніку чаго паўсталі, напрыклад, сумесны з калегамі альбом «Чарнобыль», выданні «Беларусь. Маленькая кніга пра вялікую краіну» і «Беларусь сінявокая». Нарэшце, у канцы мінулага года быў прадстаўлены альбом «Беларусь. Храм і краявід», які атрымаў галоўную ўзнагароду штогадовага конкурсу «Мастацтва кнігі», прысвечанага дызайну і афармленню. Нас таксама прыцягнуў найбагацейшы досвед вандровак, альбо «сафары», па краіне, таму падчас сустрэчы з Дзянісам Раманюком мы пагаварылі пра беларускія храмы, водгукі чарнобыльскай катастрофы і найлепшыя мясціны Беларусі.**



Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА.

***— Як выдавец вы паказалі краіну праз крыжы, народныя строі, чарнобыльскую зону, стыхію вады, а адкуль узялося спалучэнне храма і краявіду? Чаму саміх па сабе храмаў, без кантэксту, недастаткова?***

— Маёй апошняй глабальнай работай быў альбом «Беларусь сінявокая», і ў анатацыі да яго я пісаў, што фотаздымак без вады, як хлеб без масла — рака ці возера моцна ўпрыгожваюць наваколле. Але, увесь час фатаграфуючы, я неяк злавіў сябе на думцы, што прысутнасць храма таксама пераўтварае любы краявід, робіць яго больш знакавым, духоўным і глыбокім. Зразумела, прырода сама па сабе прыгожая, але бажніцы яе мяняюць, да таго ж яны нездарма стаяць на сваіх месцах: архітэктары ці будаўнікі падбіралі для будучых царкваў і касцёлаў найлепшыя лакацыі, якія з часам сталіся яшчэ больш маляўнічымі, бо вакол храма само сабой стваралася адпаведнае наваколле. Менавіта бажніцы для мільёнаў беларусаў, якія не маюць мора, становіліся своеасаблівым маяком — гэта першае, што мы бачым здалёк, і па чым разумеем, што мы дома. Я шмат вандраваў і здымаў для іншых альбомаў, а некалькі гадоў таму ўбачыў, што ў мяне сабралася добрая колькасць архіўных фотаздымкаў з храмамі, і тады вырашыў паказаць іх у спалучэнні з прыродай. Мае калегі звычайна засяроджваліся на архітэктуры і, каб адлюстраваць яе прыгажосць, рабілі фасадныя, буйныя здымкі саміх збудаванняў — мне гэта было ўжо нецікава, я браў іншыя ракурсы і хацеў паказаць, як храм і краявід дапаўняюць адзін аднаго.

***— Архітэктура, у тым ліку культавая, на тэрыторыі Беларусі праз рознага кшталту навалы моцна пацярпела. Ваш альбом паказвае 86 храмаў — што гэта за збудаванні і якой яны паказваюць нашу краіну?***

— Ад іншых нас у першую чаргу адрозніває шматканфесійнасць, якая ў Беларусі праяўлялася як нідзе. На сваіх фотаздымках у альбоме я адмыслова зрабіў увагу на тое, што касцёл і царква ў нас часта стаяць побач — бывае, амаль праз дарогу — і глядзяць адно на аднаго. Сюды можна далучыць сінагогі ці пратэстанцкія храмы. У кнізе таксама бачна, што Беларусь — шматландшафтная: калі ўзяць Паазер'е — гэта будуць пагоркі, рэкі, азёры і храмы на берагах, на раўнінах Палесся бажніцы знаходзяцца ў іншым асяроддзі. Зноў жа ў нас розныя храмы — ёсць, як у Рыме, ёсць так званыя «мураўёўкі» ў псеўдарускім стылі, а ёсць былыя ўніяцкія цэрквы ад маленькіх бажнічак да велічнага касцёла Звеставання Найсвяцейшай Панны Марыі ў Гродна, паказанага на вокладцы. Гэты фотаздымак я, дарэчы, шкадаваў дэманстраваць з дзясятак гадоў, бо ведаў, што ён дачакаецца свайго месца, і яго час надышоў — на вокладцы альбома ён стварае вобраз магутнай, маштабнай, еўрапейскай Беларусі.

***— Фатаграфіі, змешчаныя ў кнізе, рабіліся на працягу дваццаці гадоў. Як за гэты час змяніліся храмы, якія вы здымалі?***

— У альбоме ёсць дзве маляўнічыя царквы — Георгія Перамаганосца ў Мазыры і Святой Тройцы ў вёсцы Зёлава, якіх ужо няма: яны згарэлі. Шматлікія храмы перабудаваныя: часам у лепшы бок, як касцёл Міхаіла Архангела ў вёсцы Багданава, і мы можам гэтым ганарыцца, а бывае і ў горшы, пра што можна толькі шкадаваць. Святары, здараецца, самі праводзяць «еўрарамонты», з-за чаго выключныя фасады, напрыклад, драўляных палескіх цэркваў, хаваюцца, абшытыя сайдынгам ці абкладзеныя сілікатнай цэглай. Альбо аўтэнтычныя верхавіны былых уніяцкіх цэркваў зносяцца і замяняюцца на залатыя «цыбуліны», каб падкрэсліць прыналежнасць да праваслаўнай царквы, — гэта бяда, бывае, ад таго, што бачыш, хочацца плакаць. Таму шмат якія здымкі з альбома сталі гістарычнымі, а некаторыя такімі яшчэ стануць. Я сямнаццаць гадоў пражыў у Вільні і каля дзесяці гадоў яе здымаў. Там з густам адназначна лепш, але ўсё роўна шкада, калі абшарпанасць і подых гісторыі знікаюць праз рэканструкцыю.

***— Вы ў нейкім сэнсе працягваеце справу свайго бацькі, але пераносіце этнаграфію ў папулярны фармат.***

— Так, я спрабую зрабіць этнаграфію даступнай шырокаму колу людзей, прычым зрабіць гэта прыгожа і эфектна, бо чыста этнаграфічны альбом вывучаць будзе далёка не кожны. Патрошку я ўношу навуку ў кожнае са сваіх выданняў, але ўключаю яе ў кантэкст прыроды ці, напрыклад, архітэктуры, раблю яе «дваццаць пятым кадрам», тады яна не «грузіць» і нармальна ўспрымаецца.

***— Ці буду я мець рацыю, калі скажу, што вашыя альбомы, асабліва праз вонкавую прывабнасць, з'яўляюцца часткай папулярызацыі беларускасці?***

— Вядома ж, я сам выхаваны ў патрыятычнай сям'і: нават у 1970-х, у дрымучым Савецкім Саюзе, бацька размаўляў толькі на беларускай мове, на якую я таксама свядома перайшоў у дзявятым класе, дома ў нас стаялі народныя збанкі, інтэр'ер упрыгожвалі плеценыя з саломы конікі і птушкі, на сценах віселі палотны вядомых беларускіх жывапісцаў і графікаў. Калі я пачаў маляваць, я маляваў Беларусь — не космас, жывёл ці аголеных жанчын, а вёску, храмы, бабулек. Я люблю гэтую краіну, пры ўсіх нюансах мне тут падабаецца, я сямнаццаць гадоў пражыў у Літве, мая жонка — літоўка, але вярнуўся, бо ўбачыў, што ўсё, што я раблю ў сваім жыцці, — пра Беларусь, з Вільні я ездзіў фатаграфаваць, напрыклад, чарнобыльскую зону. Цяпер я жыву за дзевяноста кіламетраў ад сталіцы і штодня гляджу на вёску, якая, на жаль, знікае.

***— За час вашых, як вы называеце, сафары вы пабачылі розную Беларусь, але вашыя альбомы паказваюць, вядома ж, яе найпрыгажэйшую частку, у чым ёсць пэўная маніпуляцыя.***

— Так, я гэта ўсведамляю. У гэтым таксама праяўляецца мой патрыятызм — у тым, што ва ўсіх сваіх выданнях я адлюстроўваю тое, чым мы можам ганарыцца, чаму радавацца, што можа натхніць нас на ўчынкі. Мяне, напрыклад, хвалюе тэма экалогіі, і мне здаецца, мае кнігі, што паказваюць, як у Беларусі можа быць прыгожа, прымусяць лішні раз падабраць з зямлі пластыкавую бутэльку.

***— А па-за выбаркай для выданняў якой нашу краіну вы бачыце ўвогуле?***

— Увогуле я бачу, як знікаюць вёскі і носьбіты аўтэнтычнай культуры. Вёска — наш самы беларускі пласт; горад стаў касмапалітычным, сярод яго жыхароў значна менш сапраўдных беларусаў, любы з іх можа ўмомант пераехаць у іншую краіну, а ў гэты час вяскоўцы моцна прывязаныя да сваёй зямлі, толькі яны знікаюць проста на вачах. Мая суседка іншы раз просіць мяне паглядзець за яе курамі, пакуль яна з'ездзіць у краму ці касцёл, і для яе праехаць некалькі кіламетраў ужо вялікая падзея. Мне гэтага вясковага пласта будзе вельмі не хапаць. Так, застанецца прыгожая прырода, але нават бажніца, што яе аздабляе, паўстае дзякуючы чалавеку і без чалавека немагчымая, тым часам парафіі знікаюць адна за адной, іх пачынаюць аб'ядноўваць, як сельсаветы. Калі ў 2004 годзе я пачаў стала ездзіць да сябе ў вёску, там было дваццаць пяць кароў, назіраць за гэтымі статкамі некалі было такой рамантыкай, а сёння — ніводнай, па малако я езджу за некалькі кіламетраў. Пятнаццаць гадоў таму ўсе хаты былі жылыя, а сёння, каб палічыць, колькі іх засталося, хопіць пальцаў дзвюх рук. Усе гэтыя працэсы для мяне як фатографа — катастрофа. Зніклі каровы — знікаюць і панарамы, бо там, дзе яны некалі пасвіліся, у лепшым выпадку паднімаецца лес, але звычайна — непралазныя хмызы, што закрываюць прыгожыя краявіды. Бывае, я адмыслова падбіраю пару года і прыязджаю ў нейкае месца, дзе ўжо бываў, але часам аказваецца, што ўдарыс ужо прыватызаваны гушчаром. У поймах палескіх

рэк водзіцца восемдзесят працэнтаў папуляцыі вяртлявай камышоўкі, але і без таго знікаючы від аказваецца пад пагрозай, бо на тэрыторыі не пасецца жывёла, у выніку мясціны зарастаюць кустоўем і становяцца для птушкі некамфортныя. Сёння мы і да берагоў азёр не падыдзем — увогуле былы вобраз Беларусі «з'ядаецца».

***— Вы вандруеце па краіне ўжо амаль 45 гадоў. Наколькі імклівая, па вашых назіраннях, тэндэнцыя знікнення аўтэнтыкі?***

